В номере:
Лечение с проживанием с. 6
Вишинг – атака на доверчивых с. 5
Уборка не терпит суеты с. 8







Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

№93 (10911)

7 снежня 2019 года
Субота

ЗАЎТРА – ДЗЕНЬ СТРАХАВЫХ РАБОТНІКАЎ



Страхавы агент прадстаўніцтва Белдзяржстраху Галіна Цыганкова (чытайце на 2 с.)

## Весткі з месцаў

### Хуткая. І новая

**Цэнтральная раённая бальніца днямі абнавіла аўтапарк. Аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі з неабходным медыцынскім аснашчэннем набыты на сродкі раённага бюджэту.**

"Газель" ужо выкарыстоўваецца ў абслугоўванні насельніцтва горада. Як паведамілі ў адміністрацыі ЦРБ, аўтамабілі хуткай медыцынскай дапамогі, а па Добрушы іх курсіруе пяць, ажыццяўляюць ад 30 да 35 выездаў за дзяжурства. Як адзначыў намеснік галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя Віталь Драздоў, у рэжыме такой актыўнай эксплуатацыі транспартныя сродкі патрабуюць замены прыкладна праз 5-6 год.

**Наталля ХАДУНЬКОВА**

### Папера спаду не пацерпіць

**Папяровая фабрыка "Герой працы" наладзіла партнёрскія адносіны з пакупнікамі абгортачнай паперы ў Польшчы.**

За 2019 год у гэту краіну рэалізавана 390 тон такой прадукцыі на суму 117 тысяч еўра. У сярэднім за месяц фабрыка адпраўляе ў Еўрасаюз 120-130 тон паперы. Аб'ёмы паставак павялічваюцца.

Як паведамілі ў аддзеле збыту і маркетынгу прадпрыемства, 86 працэнтаў экспартнага аб'ёму продажу прадукцыі добрушскіх папернікаў прыпадае на ўсходнюю суседку – Расію.

**Леанід МІНІЧ**

### Ахова ад вірусу

**У раёне завяршылася кампанія па імунізацыі насельніцтва супраць грыпу. Як паведамілі ў раённым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, прышчэпкі зроблены 14 390 жыхарам раёна.**

Як стала вядома, фінансаванне кампаніі праходзіла з некалькіх крыніц. На сродкі рэспубліканскага бюджэту прышчэплены найменш устойлівыя перад вірусам катэгорыі грамадзян. З мясцовага бюджэту была прафінансавана імунізацыя 6835 чалавек – школьнікаў, работнікаў устаноў адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю. Амаль 3 тысячам чалавек зроблены прышчэпкі за ўласныя сродкі або за кошт прадпрыемстваў.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

Добрушскі край

Не упустите свой шанс!

1. ОФОРМИТЕ ПОДПИСКУ на полугодие
2. ОТПРАВЬТЕ КСЕРОКОПИЮ КВИТАНЦИИ
3. УЧАСТВУЙТЕ В АКЦИИ и претендуйте на один из подарков




Адрес редакции: г. Добруш, ул. Советская, 33

Цена подписки на квартал – 20 руб. 70 коп., на полугодие – 41 руб. 40 коп.

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 7.36
Луна
7, 8 декабря – в Овне,
9, 10 – в Тельце

Полнолуние
12 декабря

**8 декабря**
НОЧЬЮ 0…-2
ДНЕМ +1…+3
Сплошная облачность.
Возможен дождь.
Ветер ю.-западный 4-6 м/с.

**9 декабря**
НОЧЬЮ около 0
ДНЕМ +2…+4
Сплошная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер ю.-западный 5-7 м/с.

## Уважаемые работники и ветераны страховой отрасли района!



*Поздравляем вас с профессиональным праздником – Днем страховых работников!*

*Ваш труд важен и нужен для обеспечения стабильности в обществе. Страховая деятельность – ответственная и востребованная работа, требующая определенных личных качеств и большого желания. Вы не просто продаете услуги, ваша миссия – нести страховую культуру населению района. Страховые продукты, которые вы предлагаете, дают гражданам чувство защищенности и уверенности в своем материальном благополучии.*

*Желаем вам плодотворной работы, успешного воплощения и реализации планов и задач, стабильности, благополучия, здоровья, успехов, радости и счастья!*

**Районный исполнительный комитет**
**Районный Совет депутатов**




**Дорогие коллеги, уважаемые сотрудники и ветераны представительства Белгосстраха по Добрушскому району!**

*Сердечно поздравляем вас с профессиональным праздником! Вы дарите людям уверенность, а иногда и надежду, сильнее которой нет ничего. Беспечная жизнь окружающих – ваша привычная работа, в которую вы вкладываете свой профессионализм, внимание к людям и частичку души. Ваша цель – гуманна: научить людей думать о завтрашнем дне, чтобы уберечься от жизненных напастей. Пусть как можно чаще для вас звучат в ответ искренние слова благодарности.*

*Желаем вам бодрости духа, новых достижений, здоровья и вдохновения в работе. Удачи, благополучия, профессионального роста. Спасибо вам за добросовестный труд и любовь к профессии!*

**Администрация, профсоюзный комитет**
**представительства Белгосстраха**

ТЕМА НЕДЕЛИ

## О роли парламентариев, независимости и интеграции

**Президент Беларуси Александр Лукашенко во Дворце Независимости выступил с обращением к депутатам Палаты представителей и членам Совета Республики Национального собрания Беларуси шестого и седьмого созывов, передает корреспондент БелТА.**

В своем выступлении Глава государства подробно остановился на истоках белорусского парламентаризма и на том, как уже в годы суверенной Беларуси удалось отвести страну от края пропасти, установить правовой порядок, построить сильное и жизнеспособное государство. Немалая роль в этом принадлежала парламенту, который за эти годы принял более 2 тысяч законов.

Александр Лукашенко оценил итоги прошедшей парламентской избирательной кампании, отметив открытую конкурентную борьбу. Президент подчеркнул, что сделанный белорусами выбор в очередной раз показал стабильность общества, его приверженность традиционным ценностям и стремление к мирному созиданию. Он также обозначил задачи, стоящие перед новым составом парламента. Самая глобальная – это участие в обсуждении изменений, которые необходимо произвести в Основном законе страны – Конституции. Подробно Глава государства остановился и на вопросах внешней политики, в частности, отношениях с Россией и обсуждаемой интеграционной повестке.

# З полісам – надзейней

## Адна з пераможцаў рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства сярод страхавых агентаў Беларусі працуе ў прадстаўніцтве Белдзяржстраху па нашым раёне

– 21 год прайшоў, як адзін дзень, – сваю прафесійную біяграфію Галіна Цыганкова расказала лаканічна. – Цяжка і палічыць, колькім людзям дапамагла зберагчы маёмасць.

А кіраўніцтва палічыла: сёлета агент заключыла амаль 1100 страхавых дагавораў, 750 з іх – па добраахвотных відах страхавання.

Калі пачынала, прызнаецца суразмоўца, сумнявалася, што хопіць цярплівасці і настойлівасці. Бо менавіта гэтыя якасці важныя для страхавога работніка. І хоць ладзіць з людзьмі Галіна Пятроўна навучылася за час працы ў райспажыўтаварыстве, пераканаць страхавацеляў іншы раз было нялёгка. “Тавар”, які яна прапануе, у адрозненне ад таго, што ў краме, на выгляд не ацэніш...

– Зараз працаваць значна лягчэй, – дзеліцца разважаннямі Галіна. – Людзі ўсё менш спадзяюцца на дапамогу аднекуль, клапоцяцца пра будучыню самі. Гэта – аб дабрушанах, якія афармляюць полісы страхавання будынкаў і маёмасці ад стыхійных бедстваў. Некаторыя кліенты прадстаўніцтва, якія жывуць на вуліцах Багдановіча, Янкі Купалы, Дачнай, атрымлівалі выплаты за сапсаваную паводкай асабістую маёмасць. Тых жа, хто застаўся ні з чым, бо не аформіў страхоўку своечасова, Галіне Цыганковай па-чалавечы шкада. Каб пазбегчы непрыемных сітуацый, страхавы агент, як сіноптык, сочыць за надвор’ем. Вось і гэта зіма чакаецца снежнай. Значыць, трэба загадзя абысці домаўладанні прыватнага сектара і папярэдзіць гаспадароў аб магчымай паводцы. Нагадаць ім: кампенсаваць страты дапаможа дагавор страхавання.

– Гаспадары новых дамоў таксама не застаюцца без увагі, – расказвае Галіна Цыганкова. – Дарэчы, узнос па страхаванні новага дома – сімвалічны. Аплачваць можна памесячна. Пажаданні і магчымасці кліентаў улічваем.

Каму прапанаваць “зялёную картку”, каму – страхаванне ад няшчаснага выпадку. Да каго прыйсці дадому, а да каго – на месца работы. Увечары, у выхадны – страхавы агент зробіць так, як зручна кліенту. Працоўны дзень – ненарміраваны, адказнасць пры рабоце з грашамі і бланкамі строгай справаздачнасці – вялізная. І ўсё дзеля таго, каб у выпадку форс-мажору чалавек не застаўся сам-насам з праблемай.

**Людміла НАЗАРАВА**

НА СВЯЗИ

***9 декабря с 10.00 до 12.00 по телефону 5-71-25***
пройдет прямая телефонная линия с участием Марии Викторовны ИНЧИНОЙ, исполняющей обязанности прокурора района.

ПАДПІСКА-2020

# Паштальёнаў чакаюць у кожным доме



Паштальёны Алена Пагарцава і Кацярына Фацеева

**Заспець у службовым памяшканні ўсіх трох работніц аддзялення паштовай сувязі Кругавец журналісты “ДК” палічылі за ўдачу. Аказалася: машына са свежай прэсай з райцэнтра па серадах прыязджае сюды бліжэй да апоўдня. Спачатку завозіць пошту ў Завідаўку. Там таксама шмат падпісчыкаў, у ліку якіх нямала прыхільнікаў “Добрушскага краю”.**

– Тыраж раёнкі ўтрымліваем на аптымальным узроўні – не ніжэй за паказчык папярэдняга перыяду. У снежні, напрыклад, лічбу пераўзышлі на 8 экзэмпляраў, – заўважае начальнік аддзялення Тамара Лапаценка. – Хацелася б, каб газета прыходзіла ў кожны дом, але ў сённяшніх умовах гэта маларэальна. Колькасць насельніцтва змяншаецца. Пры правядзенні падпісных кампаній арыентуемся перш за ўсё на пенсіянераў. Заходзім да кожнага, нагадваем, просім.

Плён прыносяць і стасункі з кіраўніцтвам мясцовага горна-абагачальнага камбіната. Паштальён Кацярына Фацеева мае добрыя адносіны з ідэолагам прадпрыемства Юліяй Грабко, не саромеецца прыйсці і на планёрку да кіраўніка.

– У справе падпіскі такія сродкі дзейсныя, – кажа работніца з 12-гадовым стажам. – Кожны любіць увагу. Трэба толькі ведаць, калі да чалавека падысці. Не толькі ў дзень атрымання пенсіі або зарплаты, але і ўлічыць жыццёвыя абставіны, настрой, урэшце.

Сцежка да 93 дамоў, жыхары якіх зараз атрымліваюць “ДК”, паштальёнамі пратаптана. Ёсць ужо і вяскоўцы, якія паклапаціліся пра падпіску на наступны год. Жыхарка Кругаўца-Калініна Людміла Нікіценка, напрыклад, – адна з тых, каму паштальён Алена Пагарцава афармляе квітанцыю адразу на паўгода.

– Вялікі плюс у рабоце з людзьмі – калі іх ведаеш, – заўважаюць паштальёны. – Прапанаваць раённую газету можна кожнаму, бо яна піша пра наш раён, нашых людзей.

**Людміла ФЁДАРАВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**